УДК 373.31

# СІСТЭМА РАБОТЫ ПА РАЗВІЦЦІ ВУСНАГА І ПІСЬМОВАГА МАЎЛЕННЯ Ў ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ НА І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

**Вронская Вольга Браніславаўна**

настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 6 г. Магілёва” (г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)

**Анатацыя.** Нацыянальная адукацыйная сістэма заклікана адрадзіць страчаныя духоўныя каштоўнасці беларускага народа. Аўтар зяртае ўвагу, што авалоданне мовай, маўленнем –

неабходная ўмова фарміравання сацыяльна актыўнай асобы, а ўрокі беларускай мовы і літаратурнага чытання дапамагаюць школьнікам паступова ўваходзіць у свет літаратурнай мовы, спрыяюць адраджэнню духоўнасці.

**Ключавыя словы:** беларуская мова, развіццё мовы, вуснае і пісьмовае маўленне, слоўнікавы запас.

Задача настаўніка пачатковых класаў – дапамагаць школьнікам паступова ўваходзіць у свет літаратурнай мовы, рабіць яе сродкам пазнання наваколля, абмену думкамі, развіцця мыслення. Ніхто іншы, як школа, павінна даць не толькі веды, але і развіць густ да беларускага слова, адкрыць радасць далучэння да яго хараства.

Авалоданне мовай, маўленнем – неабходная ўмова фарміравання сацыяльна актыўнай асобы. Умець граматна гаварыць, выкладаць уласныя думкі ў вуснай і пісьмовай формах, развіваць уменне мець зносіны неабходна кожнаму чалавеку. Таму адной з найбольш важных задач на сучасным этапе навучання з'яўляецца развіццё маўленчай дзейнасці малодшых школьнікаў. Сучасная нацыянальная адукацыйная сістэма заклікана адрадзіць страчаныя духоўныя каштоўнасці беларускага народа. Мы павінны ганарыцца сваёй мовай, звычаямі, традыцыямі. На жаль, для большасці малодшых школьнікаў нашай краіны беларуская мова не з'яўляецца мовай мыслення, сапраўднае беларускамоўнае асяроддзе для іх адсутнічае. Як абудзіць цікавасць юных беларусаў да мовы нашых продкаў? Як зрабіць заняткі больш прывабнымі для навучэнцаў?

Для мэтанакіраванага развіцця маўлення вучняў важна арганізаваць на ўроку актыўную маўленчую дзейнасць на аснове прапанаванага вучэбнага матэрыялу. Найбольшы навучальны эфект будзе мець такая арганізацыя працы па развіцці маўлення, якая наблізіць выкананне вучэбнай задачы да натуральнага маўлення. Работу па развіццю вуснага і пісьмовага маўлення вучняў пачынаем з першага дня іх у школе. Практыкаванні, якія гэтаму спрыяюць, праводзім на кожным уроку мовы, паступова ўскладняючы іх  па меры пераходу вучняў у наступны клас. Развіццё маўлення на занятках спрыяе павышэнню матывацыі вучняў, удасканаленню іх моўнай культуры, абуджэнню цікавасці да твораў беларускай дзіцячай літаратуры.

Папаўненне слоўнікавага запасу адбываецца на працягу ўсяго жыцця чалавека, але неабходнасць узбагачэння слоўніка асабліва востра адчуваецца ў 1–4 класах. Найбольш прагназуюцца цяжкасці, звязаныя з абмежаваным лексічным запасам вучняў. У гэтым выпадку рыхтуем словы, якія могуць выкарыстаць вучні для адказу. У нашам метадычным арсенале маецца вялікая колькасць прыёмаў для арганізацыі маўленчага ўзаемадзеяння паміж вучнямі: складанне выказвання па малюнку ці серыі малюнкаў, па апорных словах, разыгрыванне дыялогаў, інтэрв'ю на пэўную тэму, маўленчы турнір і інш. З мэтай актывізацыі слоўнікавага запасу дзяцей выкарыстоўваем шэраг практыкаванняў, у тым ліку знаёмства вучняў з новымі для іх словамі і высвятленне сэнсу незразумелых слоў; назіранне за словамі ў кантэксце і

тлумачэнне новых значэнняў ужо вядомых слоў (мнагазначнасць слова), падбор сінонімаў і антонімаў. Пры рабоце са словамі ўжываем такія прыёмы, як дэманстрацыя прадмета, малюнка, муляжа, чучала, паказ дзеяння; увядзенне слова ў сказ; раскрыццё значэння слова пры дапамозе тлумачэння; падбор аднакарэнных слоў; адгадванне загадак; складанне сказа з дадзенымі словамі; падбор да слоў, якія абазначаюць прадметы, аднакарэнных са значэннем дзеяння або прыметы.

Шэраг практыкаванняў з поспехам выкарыстоўваем для фарміравання навыкаў маўлення і інтанацыйнага слыху з першага класа. Найважнейшымі з іх з'яўляюцца:

1. Складанне сказаў па малюнках, ілюстрацыях, на аснове прачытанага ці праслуханага з заданнем перадаць радасць, смутак, весялосць.

2. Чытанне тэкстаў са спецыяльным заданнем: зрабіць паўзы на месцы знакаў прыпынку ў сярэдзіне і ў канцы сказаў, у канцы вершаванага радка, слупка верша, інтанацыйна адзначыць важнае па сэнсу слова ў сказе, выдзеліць пэўнае слова лагічным націскам, вымавіць ціха, гучна, хутка, павольна пэўны сказ, выраз, слова.

3. Чытанне тэкстаў з заданнем вымавіць адпаведныя сказы з пытальнай, пабуджальнай ці клічнай інтанацыяй; з інтанацыяй паведамлення, ухвалення ці асуджэння.

4. Неабходна паказаць дзецям, што гукі, умоўна кажучы, бываюць "ласкавыя" і "грубыя". На думку А. В. Солахава, гук [л] сустракаецца часцей у ласкавых словах (матуля, дзядуля, бабуля), а гукі [г] і [р] у словах грозных ці гучных (град, гром, грукат) [2, с.25].

Вялікую цікавасць у дзяцей выклікаюць заданні, звязаныя з падборам слоў з блізкім значэннем (сінонімаў) і з супрацьлеглым (антонімаў). Практыкаванні могуць прысвячацца "пошукам" сінонімаў, якія абазначаюць якасці чалавека (смелы, адважны, храбры), характарызуюць яго стан (сумны, невясёлы, хмарны), апісваюць яго дзеянні (памчаў, пабег). Нельга абысці на ўроках і такую з'яву, як антонімы. Гэты сродак стварэння кантрастаў садзейнічае больш яркаму і выразнаму ўспрыманню мовы. Невыпадкова антонімы вельмі часта з'яўляюцца кампанентамі прыказак, казак, сустракаюцца ў загалоўках баек. У народных казках з дапамогай антонімаў супрацьпастаўляецца дабро і зло, любоў і нянавісць, радасць і смутак. У пачатковых класах варта дабіцца, каб вучні не толькі знаходзілі антонімы, але і выкарыстоўвалі іх у сваёй мове. З гэтай мэтай можна прапаноўваць заданні на замену слоў у мастацкім тэксце, складанне вусных ці пісьмовых паведамленняў на блізкія вучням тэмы (аб вучобе, прыродзе).

Разуменне фразеалагізмаў, выкарыстанне іх у вуснай і пісьмовай мове з'яўляецца пэўным паказчыкам узроўню валодання роднай мовай. Фразеалагізмы з'яўляюцца нацыянальным моўным багаццем: з іх дапамогай можна вобразна характарызаваць людзей, апавядаць аб акружаючым свеце. На

жаль, настаўнікі пачатковай школы амаль не выкарыстоўваюць фразеалагізмы, што стрымлівае развіццё мовы вучняў. Фразеалагізмы нельга скласці самому, яны патрабуюць выключнай чуйнасці і разумення. Чым больш іх будзе ведаць вучань, тым дакладней і прыгажэй зможа выказаць сваю думку. Самымі простымі і даступнымі для дзяцей з'яўляюцца практыкаванні на замену ўстойлівых спалучэнняў сінонімамі.

Надзвычай важна ўмець правільна ў лагічных і граматычных адносінах будаваць сказ. Сказ – аснова для правядзення ўсёй арфаграфічнай і слоўнікавай работы. Значнае месца адводжу складанню сказаў па малюнках, апорных словах, пытаннях і г.д.

Для развіцця фанематычнага слыху малодшых вучняў, павышэння культуры мовы, адпрацоўкі выразнасці дыкцыі можна эфектыўна выкарыстоўваць розныя гульнявыя формы. Карысны матэрыял для зняцця напружанасці, стомы і адначасова для развіцця маўлення – лічылкі, скорагаворкі, чыстагаворкі. Дзеці непрыкметна для сябе і без асаблівых намаганняў запамінаюць словы, вучацца інтанацыі, рытміцы мовы [1, с. 77].

У развіцці мовы малодшых школьнікаў значную ролю адыгрывае пераказ. Ён узбагачае слоўнік, развівае навык самастойнай перадачы думкі, замацоўвае веды па граматыцы і арфаграфіі. Дзеці пераказваюць тэкст па пытаннях, выдзяляюць галоўную думку твора, знаходзяць сказы, якія могуць быць адказам на пастаўленыя пытанні; падбіраюць загаловак да ўсяго тэксту або яго частак [3, с. 15]. Абавязковай умовай лагічнага, паслядоўнага пераказу лічым ўменне скласці план будучай пісьмовай работы, уявіць яе змест і структуру.

Пачэснае месца ў рабоце па развіццю мовы займае сачыненне. Яно нібы падсумоўвае ўсё, што рабілася на ўроках чытання і граматыкі. Зразумела, на пачатковым этапе дзецям цяжка падбіраць патрэбныя словы, складаць сказы і размяшчаць іх у пэўным парадку. Выкарыстоўваем наступныя тыпы сачыненняў: па серыі малюнкаў, па карціне, па малюнку (апісанне прадмета), на аснове ўласных назіранняў.

Наш вопыт дазваляе сцвярджаць, што ўважлівы падыход да кожнага практыкавання, да кожнай работы творчага характару спрыяе развіццю мыслення і маўлення дзяцей, прывіццю цікавасці да роднай мовы, павышэнню іх агульнай моўнай культуры. Задача настаўніка заключаецца ў тым, каб дзеці зразумелі, што родная мова вельмі багатая і гэтым багаццем трэба ўмела карыстацца.

## Спіс літаратуры


1. Канус, М. І. Гучы, роднае слова. / М. І. Канус, Ж. Н. Прыймак. – Мінск : ТАА "Авітон", 1994. – 80 с.
2. Солахаў, А. В. Займальна ад А да Я / А. В. Солахаў. – Мінск : ТАА "Лексіс", 2004. – 63 с.
3. Скажы па-беларуску: дапаможнік для выхавальнікаў і бацькоў / Т. М. Шылько. – Мінск : УП Рэдакцыя навукова-метадычнага часопіса «Пачатковая школа», 2004. – 54 с.